**Афіцыйна.** Вадзім Гігін узначаліў Нацыянальную бібліятэку Беларусі, паведамляецца на сайце НББ. Паводле слоў міністра культуры Анатоля Маркевіча, кіраваць алмазам ведаў ганарова і адначасова вельмі адказна. Перад новым генеральным дырэктарам стаіць асноўная задача — захаваць і прымножыць векавы досвед Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Пры гэтым, звярнуў увагу міністр культуры, яму неабходна заняцца такімі пытаннямі, як кадравае забеспячэнне, умацаванне матэрыяльнай базы ўстановы, стварэнне аўтаматызаванай сістэмы «Электронная бібліятэка», а таксама метадычнае суправаджэнне і забеспячэнне кантролю дзейнасці публічных бібліятэк краіны.